


## «...БО ПОБАЧ З ДЗЕЦЬМІ ЗАЎСЁДЫ БОГ»

Галоўная цацка ў цяперашніх дзяцей — камп'ютар у розных яго іпастасях. Зрабіць штосьці самім (тую ж лусту хлеба адрэзаць) дзесяцігадовы хлапчук часцяком не ўмее. Што зусім не дзіва: бацькі асцерагаюцца даваць яму нож...

У час майго дзяцінства цацкі мы рабілі сабе самі, і галоўнай з іх была рагатка. Не без таго, здаралася, падчас «вытворчасці» рэзалі пальцы, але кроў не спыняла нашу работу: былі б матэрыялы!

Якія?

На выраб першай маёй рагаткі пайшла старая грэлка. З яе было цяжка страляць ды і паслужыла яна нядоўга.

Новую мы з сябрам Колькам зрабілі з веласіпеднай камеры. Абнавілі: доўга стралялі па бутэльках, а потым, стаміўшыся, селі адпачыць каля нашых варот. Знізу пад імі была дошка, і Колька ад няма чаго рабіць паваліў яе — рукой.

Мне прыйшлося згойсаць у двор — паставіць дошку на месца.

Пакуль прыбег назад, Колька паваліў яе.

— Ты што — здурнеў? Болей так не рабі! — накінуўся я на сябра і зноў пабег у двор, каб падняць дошку. Пакуль падняў...

Усё, карацей, паўтарылася.

І тады я вельмі раззлаваўся: моўчкі і чарговы раз папраўляўшы дошку, я падняў добры камень і «зарадзіў» ім рагатку, выйшаў на вуліцу і паволі рушыў да Колькі. Той у гэты час... зноў выбіў дошку.

Чаму нагой, я зразумеў тут жа, бо, «стрэліўшы» з рагаткі яму ў лоб, адразу ж схапіўся за свой: Колька «стрэліў» у мяне...

Мы маглі (ды што там — павінны былі!) павыбіваць адзін аднаму вочы, але...

Другім разам мы, некалькі хлапчукоў, гулялі ў двары таго ж самага Колькі. У руцэ ў яго была важкая батарэйка да плоскага ліхтарыка, і ён (не ведаю, што на яго найшло?) размахнуўся і шпурнуў яе ў чародку сваіх курэй.

Зноў жа не ведаю, наўмысна ці не, але батарэйка трапіла ў пеўня і той упаў як падкошаны.

Спалоханы Колька кінуўся да яго, паставіў птушку на ногі, трохі патрымаў, адпусціў — певень зноў паваліўся.

— Пеця, стой, не памірай! — праз слёзы прасіў яго Колька. Але певень падаў і падаў...

Спытаеце, што ў гэты час рабілі мы?

Ці паверыце, — рагаталі (дзеці і сапраўды часам дурныя і жорсткія).

Рагаталі найболей з Колькі, бо ведалі, што слёзы яго няшчырыя, што плача ён не па пеўні, а па ўласным заднім месцы, якому дастанецца ад бацькоў не менш, чым гэтаму пеўню...

Ад непазбежнай, як здавалася, лупцоўкі Кольку ўратавала... яго ж ахвяра: пявун нібыта пачуў дзіцячыя «малітвы», ён раптам... ачуняў: стаў на ногі, страсянуў сваім пер'ем, як нічога ніякага пайшоў да курэй.

Карацей, і гэтае свавольства скончылася добра. Можа, таму, што побач з дзецьмі заўсёды Бог.

**Яўген Шастакоў,**

*г. Гомель.*

## І ДОМА, І ЗАМУЖАМ

...Усё, вучоба скончана, вечарам — выпускны. А там, як вядома, і музыка, і танцы, і смех, але ж мне — зусім не да іх. І прычына таму самая банальная: у мяне другі дзень ні ежы, ні грошай. І дамоў я траплю толькі праз суткі.

Гэтыя беспрасветныя думкі абрывае нечы спагадлівы голас:

— Што — сумнавата без мужа? Ён не прыйшоў?

Пытае пра гэта адна з выкладчыц, і я, можна сказаць, даўлюся сваім абураным «Які яшчэ муж?!», бо ўспамінаю, што выкладчыкі і праўда лічаць мяне замужняй.

Чаму? Раскажу.

Так атрымалася, што на першым курсе я прапусціла цэлы тыдзень заняткаў. Ды і потым з'явілася на іх, можна сказаць, не спаўшы (цягнік прыходзіў у 8 раніцы), проста з вакзала... Факт, што выклікаюць мяне, пра нешта пытаюцца, а я, што называецца, ні сном ні духам — нават тэмы не ведаю: стаю — слуп слупам... Бо не расказваць жа ўсім, што бацькоў у мяне няма, што за іх — старэйшая сястра, што яна якраз захварэла, што і яе, і гаспадарку трэба было дагледзець... І дэведку аб гэтым мне б ніхто не даў...

Карацей, я разгублена маўчала. І тут на выручку мне прыйшла сяброўка:

— Маргарыта Давыдаўна, — звярнулася яна да выкладчыцы, — павіншуйце Чыгрынаву, яна замуж выйшла!

— Віншую, — не то вінавата, не то здзіўлена прамовіла жанчына. — Ну вядома ж, віншую вас! Сядайце.

Такім чынам 1 красавіка (не так важна, якога года) мяне, што называецца, выдалі замуж першы раз.

Хутка я «выйшла» зноў.

Пасля вучобы мяне накіравалі на працу ў Барысаўскі раён. Там у аддзеле культуры прапанавалі на выбар дзве вёскі Вяляцічы ды Аздзяцічы і не то жартам, не то ўсур'ёз сказалі, што ў першай могуць пабіць, а ў другой — накорміць, напаіць, а потым абгаварыць.

«Бітай быць не хачу, а плёткі да мяне не прыстануць», — уголас падумала я і апынулася ў Аздзяцічах. Знайшла там кватэру, пазнаёмілася са сваім начальствам, потым з'ездзіла дадому рэчы забраць. Час вяртацца назад, а як, калі білетаў на цягнік няма і не прадбачыцца? Выходзіць, што працоўную дзейнасць я пачну з прагулу?!

Ад адной гэтай думкі мароз па скуры!

І тут, бачу, міма праходзіць група чыгуначнікаў. І аднаго з іх я, здаецца, бачыла ў Магілёве. Падбягаю, вітаюся, кажу:

— А я ваша суседка! Мы побач жывём... Але зараз мне вельмі трэба ў Барысаў. Ну вельмі...

— І мужу таксама? — усміхаецца ў адказ мужчына, гледзячы мне за плячо.

— А як жа, — чуецца адтуль, і каж гэта... нейкі вайсковец. Ды яшчэ з дзіцем...

У выніку «суседу»-чыгуначніку нічога не застаецца, як падвесці нас да брыгадзіра поезда ды сказаць:

— Вазьмі гэту пару.

Цуды здараюцца: той сапраўды бярэ нас! Мы — у тамбуры, брыгадзір выдае білеты і тут...

Дзіця, якое дагэтуль маўчала, на ўвесь голас крычыць:

— Ты не мая мама! Не мая! Адыдзіся ад таты! Чуеш?!.

Мне хоць скрозь зямлю праваліся: за разлучніцу зараз прымуць...

Брыгадзір, на шчасце, ні на што не звярнуў увагі: выдаў білеты і знік.

А мяне пасля гэтага дурны нейкі смех разабраў! «Муж» далучыўся... Сынок яго таксама не вытрымаў: мы рагаталі разам, да слёз!

Напэўна, таму да Барысава даехалі досыць хутка, а ўжо там разышліся, як у моры караблі: кожны ў свой бок.

...Трэці раз я выходзіла замуж ужо па-людску: і ўсур'ёз, і на ўсё жыццё.

**Л. М. Чыгрынава,**

*г. Мінск.*

## БЕДНЫ ПЕЦЯ

Вы не думалі, чаму ў Амерыцы бізнес такі раскручаны, моцны, а мы столькі часу вучымся, стажыруемся, б'ёмся, але прабіцца на больш-менш прымальны ўзровень так і не можам?

Мне здаецца, што прычына тут відавочная: бізнесоўцаў трэба выхоўваць змалку, можа, нават у спецыяльных школах, з адмысловымі педагогамі... Не кажучы ўжо пра сям'ю, пра бацькоў. Яны — амерыканскія і нашы — ну вельмі розныя. Першыя, наколькі ведаю, ледзь не з пялёнак прывучаюць малых да самастойнасці, да таго, што на ўсё (а тым больш на смачную цукерку) трэба зарабіць, што разлічваць можна толькі на сябе...

А вось нашы бацькі, наадварот, — лічаць, што, калі нарадзілі дзяцей, значыць, павінны і забяспечваць. Спачатку — іх шчаслівае маленства, потым юнацтва, сталасць, а калі пашчасціць, дык яшчэ і старасць. Яны, бацькі, як належнае прымаюць просьбы нашчадкаў даць грошай на марозіва, на дыскатэку, на планшэт і тэлефон, на вучобу, машыну, кватэру, дачу і гэтак далей...

Зрэшты, асобныя з малых усё ж спрабуюць зарабляць самі! І раней спрабавалі таксама.

...У знаёмых вяскоўцаў першым нарадзіўся сын, пазней, недзе гадкоў праз шэсць ці сем, у сям'і з'явілася дзяўчынка.

З гэтай нагоды бацькі па завядзёнцы вырашылі гасцей сабраць. І добрыя атрымаліся б хрэсьбіны, калі б не сынок.

Ён што тады ўдумаў? Згледзеў, што бацька ў каморы бярэ бутэлькі з самагонам, носіць на сталы, пакідае, а ўзамен нічога не бярэ. «Гэта ж непарадак, — падумаў малы, — і наладзіў... гандаль: нацягаў з каморы поўных паўлітровак і з дзясятак прадаў — за сваім жа хлявом.

Ці шмат утаргаваў? Ды будзь здароў! За тую брыду (малы пакаштаваў), якая была ў бутэльках, «фарбавала» ў чырвонае твары ды «заплятала» языкі дарослым дзядзькам, ён зарабіў амаль прыгаршчы цукерак — смачных, салодкіх, у прыгожых абгортках!..

Бацькам бы пахваліць гэтае дзіця, пагладзіць яго па галоўцы, а тыя наадварот — пакрыўдзілі Пецьку.

Цяпер, відавочна, шкадуюць: маці, ва ўсякім разе, гаворыць, што бедны ён, працуе звычайным кіроўцам, не змог прыстасавацца да рынку, не змог нікуды прабіцца. У адрозненне ад тых жа сясцёр, якія ўмеюць круціцца і жывуць куды багацей...

А хто ў гэтым вінаваты? Ці не самі ж бацькі: не накруцілі б вушы хлапцу (ды перад гасцямі...), не адбілі б тым самым ахвоту да пошукаў выгады, можа, ён бы новым Абрамовічам стаў. А так...

Маем, што маем.

**Іван Гаральчук,**

*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**


## Годовой отчет за 2017 год ООО «Санта Ритейл»

Годовой бухгалтерский баланс за 2017 год утвержден на очередном общем собрании участников ООО «Санта Ритейл» 30.03.2018 года (протокол № 8)

| Активы | Код строки | На 31.12.2017 | На 31.12.2016 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 51248 | 36845 |
| Нематериальные активы | 120 | 1118 | 397 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 2841 | 1941 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 2377 | 2066 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **57584** | **41249** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 14687 | 10103 |
| в том числе: материалы | 211 | 801 | 464 |
| готовая продукция и товары | 214 | 13886 | 9639 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 175 | 101 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 548 | 13 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 2767 | 1861 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 14370 | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 5451 | 3390 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **37998** | **15468** |
| **БАЛАНС** | **300** | **95582** | **56717** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31.12.2017** | **На 31.12.2016** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 34288 | 16302 |
| Резервный капитал | 440 | 15 | 15 |
| Добавочный капитал | 450 | 1950 | 1950 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 7030 | 4287 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **43283** | **22554** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 20693 | 13380 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | 45 | 27 |
| Доходы будущих периодов | 540 | 2 | 5 |
| **ИТОГО по разделу IV** | | **20740** | **13412** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 400 | |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 600 | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 30555 | 20747 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 28857 | 19192 |
| по авансам полученным | 632 | 6 | 1 |
| по налогам и сборам | 633 | 127 | 112 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 232 | 128 |
| по оплате труда | 635 | 865 | 595 |
| по лизинговым платежам | 636 | 428 | |
| прочим кредиторам | 638 | 40 | 719 |
| Доходы будущих периодов | 650 | 4 | 4 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **31559** | **20751** |
| **БАЛАНС** | **700** | **95582** | **56717** |

### Отчет о прибылях и убытках
за январь – декабрь 2017 года

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 | За январь – декабрь 2016 |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 220336 | 169724 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (180679) | (139976) |
| Валовая прибыль (010-020) | 030 | 39657 | 29748 |
| Управленческие расходы | 040 | (3566) | (2590) |
| Расходы на реализацию | 050 | (37426) | (26345) |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050) | 060 | (1335) | 813 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 5978 | 3064 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (1680) | (849) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080) | 090 | 2963 | 3028 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 4837 | 1128 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 3577 | 7 |
| проценты к получению | 103 | 93 | 203 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 1167 | 918 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (3693) | (21) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (3669) | (18) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | (24) | (3) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 17 | 11 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 17 | 11 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (876) | (2607) |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | (820) | (2603) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (53) | (4) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (3) | 0 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130) | 140 | 285 | (1489) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140) | 150 | 3248 | 1539 |
| Налог на прибыль | 160 | (486) | (240) |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | (18) | (14) |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (1) | (2) |
| Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200) | 210 | 2743 | 1283 |
| Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230) | 240 | 2743 | 1283 |

По мнению аудиторской организации – ООО «Аудиторский центр «Эрудит» (свидетельство о государственной регистрации зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191404329 решением Минского городского исполнительного комитета от 26.04.2010) бухгалтерская отчетность ООО «Санта Ритейл» достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение организации по состоянию на 31 декабря 2017 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь УНП 291313486



**Считать недействительными** утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:

– квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ №№ 0195184, 0195185, 2263949, 2263954, 0548279, 0560661, 0207169 и серии КС № 0930467;

– полисы «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу» формы 2РН, 2РП серии БИ №№ 1594699, 1594907, 1552936, 1563167, 1587827;

– полис «Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско)» формы 2РН, 2РП серии АК № 0124576;

– полис «Добровольное страхование имущества физических лиц; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир» формы 2РН, 2РП серии БИ № 0029800.

УНП 100782388